**УДК 821.161.3**

**Мурзіч Эльвіра Аляксандраўна**
магістр, аспірант кафедры
тэарэтычнага і беларускага
літаратуразнаўства
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
г. Мінск, Беларусь

**Elvira Murzich**
MA in Philology, PhD Student of the
Department of Theoretical and Belarusian
Literary Studies
Belarusian State University
Minsk, Belarus
elka.karamelka21@yandex.by

# РОЛЯ БЕЛЕТРЫСТЫЧНАЙ ПАЭТЫКІ Ў НЕАРАМАНТЫЧНЫХ ТВОРАХ БЕЛАРУСКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ 1920–1930 гг.

У артыкуле разглядаюцца праявы неарамантызму і сацыялістычнага рэалізму ў беларускай літаратуры 1920–1930-х гг. Даследуецца ўзаемасувязь названых з'яў, прычыны іх распаўсюджання, характэрныя асаблівасці ў творчасці прадстаўнікоў малодшага і старэйшага пакаленняў беларускіх пісьменнікаў ранняга савецкага часу. Абазначаецца сувязь паміж напрамкам неарамантызму і актыўным развіццём літаратуры, адрасаванай шырокім народным масам.

К л ю ч а в ы я   с л о в ы: *савецкая літаратура*; *беларуская проза*; *неарамантызм*; *рэвалюцыйны рамантызм*; *сацыялістычны рэалізм*; *ідэалізацыя*.

# THE ROLE OF POPULAR FICTION POETICS IN THE NEO-ROMANTIC WORKS OF BELARUSIAN WRITERS OF THE 1920s–1930s

The article examines the manifestations of neo-romanticism and socialist realism in the Belarusian literature of the 1920s and 1930s. The interrelation of these phenomena, the reasons for their spread and the characteristic features in the work of representatives of the younger and older generations of Belarusian writers of the early Soviet period are investigated. The connection between the trend of neo-Romanticism and the active development of literature addressed to the broad masses of people is indicated.

K e y   w o r d s: *Soviet literature; Belarusian prose; neo-romanticism; revolutionary romanticism; socialist realism, idealization.*

Беларуская савецкая літаратура ў 1920–1930-я гады пачынала развіваць новыя ўласныя традыцыі – у адпаведнасці з сацыялістычным рэалізмам, які зрабіўся нарматыўным метадам творчасці з 1934 г. (пры гэтым яго прынцыпы абмяркоўваліся і вызначаліся ўжо ў 1920-я гг.). Спецыфіка гэтага метаду заключалася ў тым, што аўтары, найперш у жанры апавядання, паказвалі рэчаіснасць не столькі рэальна, колькі ідэалізавана, зыходзячы з прынцыпу сацыяльнага аптымізму. Такая скіраванасць стварала ўмовы для запатрабаванасці захапляльных сюжэтаў з белетрыстычнымі рысамі ў паэтыцы (белетрыстычным кампанентам).

Для сацыяльнага аптымізму ранніх савецкіх часоў быў характэрны пафас памкнення да «звышасабовых ідэалаў». Гэты пафас набліжаў творчасць пісьменнікаў 1920–1930-х гг. да рамантызму і, нягледзячы на распаў-

сюджанне новай, інтэрнацыянальнай ідэі, пазначаў пераемнасць з класічнай рамантычнай ідэяй славянскага адраджэння. Моладзі быў блізкі ўзрушаны настрой, звязаны з верай у надыход лепшай будучыні для людзей пасля перамогі над старым светам у 1917 годзе. Многія пісьменнікі не проста па нарматывах імкнуліся да ідэалізацыі жыцця, а сапраўды паверылі ў магчымасць шырокіх змен да лепшага. Пры гэтым шчырыя рэвалюцыянеры і творцы нярэдка патрабавалі ідэальнасці не толькі ад сваіх персанажаў, але і ад саміх сябе. Такім чынам, нягледзячы на фармальную назву агульнапрынятага напрамку «сацыялістычны рэалізм», на самай справе большая частка маладых беларускіх аўтараў пісала, выкарыстоўваючы паэтыку рамантызму, або, дакладней, *рэвалюцыйнага* рамантызму, які меў у беларускай культуры свае адметныя рысы.

Па-першае, сам напрамак рамантызму ўзнік на тэрыторыі Беларусі ў XIX ст. і быў звязаны з нацыянальна-вызваленчым рухам. Таму Кастрычніцкая рэвалюцыя, як своеасаблівы працяг нацыянальна-вызваленчай барацьбы, магла спарадзіць найперш падобны да рамантызму напрамак. Ім якраз стаў неарамантызм – пры тым, што ў 1920-я гады беларускія пісьменнікі захапляліся і рознымі плынямі мадэрнізму, авангарду. Па-другое, рэвалюцыя ў многім сапраўды давала матэрыял для рамантызаванага ўвасаблення выключных падзей. Тыя бальшавікі, якія верылі ў сваю ідэю і перамогу, самі ідэалізавалі свае дзеянні, а таму адпаведнай атрымалася і перадача многіх утапічных вобразаў у літаратурных творах. Так, напрыклад, Я. Сякерская ў артыкуле «Да пытання аб стылі пралетарскай літаратуры» адзначала наступнае: «Пралетарскі пісьменнік павінен умець не толькі паказваць чалавека, але і весці яго наперад» [1, с. 160]. Такім чынам, калі ў XIX стагоддзі ў эпоху рамантызму пісьменнікі звярталіся да апісання вызначальных для нацыянальнай свядомасці падзей з мінулага (напрыклад, часоў існавання Вялікага Княства Літоўскага), паказвалі рыцараў і князёў як людзей непераможных і адважных, то для пісьменнікаў пачатку 1920-х гг. адпаведнай тэмай стала рэвалюцыя разам з тымі, хто яе праводзіў. Важна таксама, што сучаснікам падзей, якія адбыліся зусім нядаўна, амаль немагчыма ацэньваць іх сутнасць з належнай глыбінёй і аналітызмам – для гэтага патрабуецца часавая дыстанцыя. Аднак пісьменніцкая рэакцыя на штодзённыя жыццёвыя змены была неадкладна запатрабаванай грамадствам і дзяржавай.

Існуе шмат даследаванняў, звязаных з вылучэннем рыс рамантызму ў беларускай літаратуры ранняй савецкай эпохі. Звычайна паняцці «рамантызм» і «неарамантызм» навукоўцы звязваюць з паэзіяй, абапіраючыся ў асноўным на ацэнкі творчасці Янкі Купалы [2]. Калі ў дадзеным кантэксце разглядаюць прозу, то ў якасці базы выбіраюць творы літаратурнага аб'яднання «Маладняк», якія сваёй эмацыянальнасцю шмат у чым нагадвалі паэзію; а таксама апавяданні прадстаўнікоў «Узвышша» [3; 4], і з гэтым нельга не пагадзіцца.

Менавіта ўдзельнікі названых аб'яднанняў зрабілі асабліва значны крок наперад у развіцці беларускага неарамантызму (пасля такіх узораў, як, напрыклад, паэма «Магіла льва» Янкі Купалы або балада «Страцім-лебедзь» Максіма Багдановіча, апавяданне «Роднае карэнне» і аповесць «Дзве душы» Максіма Гарэцкага). «У 20–30-я гг. XX ст. рамантычная паэтычная традыцыя, якую сто год таму распачаў на землях былога Вялікага Княства Літоўскага Адам Міцкевіч, зазнала дзіўную метамарфозу: распалася на два кірункі. Першы, што атрымаў умоўную назву "адраджанізм", працягваў адстойванне ідэалаў незалежнага роднага краю. Другі, узяўшы ад імя "маладнякізму" са старой рамантычнай традыцыі культ маладосці і пераўтваральнай мужнасці, паспрабаваў вынайсці новыя сацыяльныя мадэлі грамадства, чым спрычыніўся да агульнаеўрапейскага мадэрнізму, ствараючы на беларускай глебе свайго кшталту ўзоры квазідадаізму, футурызму, імажынізму» [5, с. 145].

У шырокім сэнсе пад неарамантызмам навукоўцы разумеюць «плынь у літаратуры і мастацтве мяжы XIX–XX стст., якая звязана з традыцыямі рамантызму, але ўзнікае ў іншую гістарычную эпоху, калі на першы план выходзіць не наватарства зместу і формы, а эстэтычны і этычны пратэст супраць дэгуманізацыі асобы і рэакцыя на натуралізм і крайнасці дэкадансу» [6, с. 309]. На думку У. А. Лукава, неарамантызм – гэта сукупнасць розных напрамкаў і плыней названага перыяду, «роднасных рамантызму (так званы неарамантычны арэол: сімвалізм, эстэтызм і інш.)» [6, с. 309]. У рамках беларускай літаратуры пазначаная фармулёўка паняцця таксама запатрабаваная, але з улікам асаблівасцей развіцця літаратурнага працэсу.

Так, натуралізм і дэкаданс як асобныя эстэтычныя з'явы праявіліся ў беларускай літаратуры менш відавочна, чым неарамантызм: напрыклад, натуралізм у творах «Антон» і «Ціхая плынь» Максіма Гарэцкага, «На зачараваных гонях» Змітрака Бядулі, «Лявон Бушмар» і «Браты» Кузьмы Чорнага; а ў рамках паэтыкі дэкадансу навукоўцы нярэдка разглядаюць узоры з паэзіі Максіма Багдановіча [7]. Аднак нельга не пагадзіцца з тым, што для беларускага неарамантызму сапраўды найперш характэрны зварот да эстэтызацыі і этызацыі літаратуры. Такой была скіраванасць, напрыклад, маладнякоўскай творчасці Міхася Зарэцкага або Кузьмы Чорнага ў раннесавецкую эпоху – з выразнай ідэйнай зададзенасцю яе зместу, але разам з тым і са зваротам да экзальтавана-пазітыўнага адлюстравання тэмы рэвалюцыі, чаканых змен да лепшага ў грамадстве. Маладнякоўцы і ўзвышаўцы (ранні П. Броўка, У. Дубоўка) звярталіся да вопыту У. Маякоўскага як футурыста-сацыяліста і таксама эксперыментавалі з формай верша. Назву «рэвалюцыйны рамантызм» савецкія навукоўцы выкарыстоўвалі ў якасці сінанімічнай для намінацыі праяў неарамантызму ў 1920–1930-я гг.

Між тым яўнай праблемай актыўнага развіцця беларускай прозы ў новых умовах зрабілася тое, што маладыя пісьменнікі, захопленыя перспектывамі будучыні, аднолькава імкнулася ў сваіх сюжэтах да адлюстравання

адных і тых жа значных падзей, прытым з аднаго і таго ж пункту гледжання. Амаль усе празаікі-пачаткоўцы імкнуліся да паказу завостраных канфліктаў, хуткага дзеяння, а не да псіхалагічнай абмалёўкі вобразаў. У выніку тагачасныя апавяданні мелі шмат агульнага ў сваіх сюжэтах, аднолькава будаваліся, паказвалі аднатыпных персанажаў, што таксама спрашчала і прыпадабняла творы адзін да аднаго. «Апавяданне ранняга перыяду беларускай савецкай літаратуры часта набывала формы імпрэсіі або контуры прыгодніцкага твора з напружанай фабулай, вострым і дынамічным сюжэтам, тыя формы, у якіх, на думку пісьменнікаў, лепш за ўсё было выявіць накал высокіх пачуццяў, масавы гераізм эпохі» [8, с. 13].

Пасля рэвалюцыі як прыкмета неарамантызму ў беларускай літаратуры ўзнік своеасаблівы культ маладосці, што адзначаецца многімі літаратуразнаўцамі (І. П. Чыгрын [4], Т. Б. Мацюхіна [9] і інш.). Яму паспрыяў той факт, што ў цэлым сярод пісьменнікаў перыяду 1920–1930-х гг. сталі колькасна пераважаць якраз маладыя людзі. Яны ўпершыню паспрабавалі сябе ў літаратурным майстэрстве, таму іх творы, часта не вельмі дасканалыя з мастацкага боку, былі прасякнуты верай у будучыню, моладзевым запалам, прагай зменаў; нездарма знакамітае аб'яднанне «Маладняк» увогуле ўзнікла і было так названа. Характэрнай і блізкай для юнацтва рысай рамантызму, што ўвасобілася і ў неарамантызме, было «супрацьпастаўленне мары і рэальнасці, таго, што магчыма, і таго, што ёсць» [4, с. 84]. Пісьменнікі 1920–1930-х гг. імкнуліся паказаць той ідэальны шлях, па якім трэба ісці грамадству, каб дасягнуць вышэйшай мэты, супастаўлялі мінулае і сучаснасць, прымянялі прыём кантрасту.

Неарамантызм адыграў вызначальную ролю ў працэсе белетрызацыі прозы ў 1920–1930-х гг. Менавіта прадвызначанасць пафасу твораў, скіраваных на апяванне Кастрычніцкай рэвалюцыі, яе герояў і яе вынікаў, падштурхоўвала ствараць захапляючыя, інтрыгоўныя сюжэты з новага жыцця – а гэта і ёсць праява белетрызацыі, сведчанне яе вялікай актуальнасці для прозы тых часоў.

Белетрыстыка – гэта пласт літаратуры, арыентаваны на чытача-сучасніка апісаных падзей. У беларускай літаратуры яна выразна і шматжанрава праявілася менавіта ў 1920–1930-х гг. Апавяданні, напісаныя самымі рознымі аўтарамі, нават яўна далёкія ад мастацкай дасканаласці, знаходзілі свайго чытача. Поруч з літаратурай для тагачасных мас з'яўлялася і па-сапраўднаму якасная белетрыстыка: не адразу, а з пачаткам увагі да характаралогіі, неабходнасці псіхалагічнай матывацыі ўчынкаў персанажаў, калі ўтрыравана-ідэальныя героі нарэшце пачалі набываць праўдзіва-чалавечыя рысы. У рамках неарамантычнай стылістыкі з яе ўвагай да інтрыгуючай сюжэтабудовы гэта бачна з асаблівай выразнасцю. Т. Б. Мацюхіна адзначае: «Нам вядома, што неарамантызм як літаратурна-мастацкая з'ява пашырае межы ўплыву на чытача і выяўляе глабальныя змены ў калектыўным досведзе грамадства, дзе жыць – значыць змагацца за шчаслівы лёс Айчыны,

перамагчы зло і зберагчы духоўнае (культуралагічнае, асветніцкае, інтэлектуальнае) багацце народу» [9, с. 58]. Беларускія аўтары XX, а затым XXI стагоддзяў, сярод якіх асабліва адзначым майстра белетрызаванай прозы М. Зарэцкага, «... выяўляюць у душы сваіх герояў зацятую ментальна-разумовую барацьбу паміж духоўным (светлым) і жывёльным (пачварным) пачаткамі, паміж філасофіяй прыстасавальніцтва, інстынктыўнага выжывання ў экстрэмальных умовах і гуманістычнай ідэяй суперажывання, міласэрнасці, узаемадапамогі адзін аднаму» [9, с. 58].

Вышэй падкрэсліваўся і зварот неарамантыкаў да разгляду этычных пытанняў, да гуманізацыі твораў. «Абстрактны гуманізм, пакладзены ў аснову неарамантызму, прадвызначае характар і паводзіны галоўнай дзеючай асобы ў мастацкім творы. Нярэдка гэта ўзвышаная, супярэчлівая, трагічная па сваіх перакананнях натура, здольная да неймаверных, часам жорсткіх учынкаў (паэма "Магіла льва" Я. Купалы; апавяданне "Ворагі" М. Зарэцкага). Духоўныя каштоўнасці лірычных герояў і персанажаў нярэдка спараджаюць і абумоўліваюць трагічны фінал мастацкага твора – доўг, абавязак перад Айчынай вышэй за каханне і жыццё, што характэрна і для класіцызму. Асоба ў неарамантычным творы пакутуе з розных прычын, вагаецца ў сваім выбары, але прымае адзінае правільнае рашэнне, суадноснае з неарамантычным ідэалам» [9, с. 58–59]. Абвостраныя перыпетыі сюжэта, звязаныя з маральным выбарам персанажа, у тым ліку названы трагічны фінал, безумоўна, уплываюць на зацікаўленасць чытача і выкарыстоўваюцца як сталыя прыёмы ў белетрыстычных творах.

Акрамя таго, важную ролю для беларускіх неарамантыкаў адыгрывала тэма кахання, якое яны паказвалі ў сваіх творах. А любоўная інтрыга – адна з асноўных рыс белетрыстыкі. Каханне «было важнай катэгорыяй эпохі і абазначала нешта большае, чым каханне мужчыны да жанчыны ці любоў маці да дзіцяці. Гэта было свайго роду непасрэднае духоўнае веданне, як бы духоўны інстынкт, з дапамогай якога чалавек успрымае як сваю ўнутраную сутнасць, так і сутнасці знешняга свету адразу, цалкам, у адзінстве духоўнага і матэрыяльнага, у якое ён пранікае» [10, с. 46].

Для пісьменнікаў сталага пакалення (Якуба Коласа, Змітрака Бядулі, Цішкі Гартнага і інш.) тэма рэвалюцыі была складанай, таму што яны, у адрозненне ад сваіх наступнікаў, не маглі задаволіцца ў яе разуменні адной радасцю ад перспектыў пабудовы новага свету. Толькі тая моладзь, чый сацыяльны статус пасля 1917 г. рэзка павысіўся, адразу засяродзілася на гэтай тэме як на асноўнай. Можна сказаць, што рэвалюцыя сапраўды зрабіла іх пісьменнікамі, і яны з верай і адданасцю абвешчаным ідэалам выконвалі сацыяльны заказ, разумеючы яго як сваё служэнне народу.

Такім чынам, беларуская літаратура 1920–1930-х гг. складвалася ва ўмовах звароту да традыцый рамантызму пры іх пераходзе да неарамантызму. Жанравы выбар пісьменнікаў у прозе гэтага часу спачатку рабіўся на карысць апавядання, прычым з неарамантычнай скіраванасцю да белетрызацыі рэальнага жыцця ў мастацкім творы. Схільнасць пісьменнікаў да малога жанравага памеру была звязана як з нявопытнасцю многіх, так і з

тым, што рэагаваць на актуальныя падзеі ў грамадстве патрабавалася аператыўна. Акрамя таго, у беларускай літаратуры XX ст. жанр аповесці і рамана пачаў з асаблівай актыўнасцю распрацоўвацца менавіта ў канцы 1920-х гг. (пры тым што папярэднія традыцыі старабеларускай літаратуры, у тым ліку перакладной белетрыстыкі, засталіся забытымі і практычна незапатрабаванымі). Пісьменнікі імкнуліся да адлюстравання вобразаў герояў рэвалюцыі, апявання нядаўніх пераломных, эпахальных падзей і засяроджвалі ўвагу на пазітыўных зменах для многіх членаў грамадства. Вядучыя героі твораў пачатку 1920-х маляваліся ідэальнымі ды ідэалізаванымі. Яны набывалі абрысы пазнавальных і зразумелых мастацкіх характараў паступова. Але разам з ростам аналітызму нярэдка страчваўся белетрыстычны кампанент: знікала апавядальная лёгкасць і надзвычайны дынамізм інтрыгі, сюжэты гублялі сваю сфакусаванасць на яскравай кульмінацыі або нечаканай развязцы, і наставаў час для вырашэння ў літаратуры ўжо іншых – заглыблена-народазнаўчых, эпічных задач.

## ЛІТАРАТУРА


1. *Сякерская, Я.* Да пытання аб стылі пралетарскай літаратуры / Я. Сякерская // Полымя. – 1930. – № 1. – С. 142–162.
2. *Багдановіч, І. Э.* Авангард і традыцыя: Бел. паэзія на хвалі нацыянальнага адраджэння / І. Э. Багдановіч. – Мінск : Беларус. навука, 2001. – 387 с.
3. *Чыгрын, І. П.* Крокі: проза «Узвышша» / І. П. Чыгрын. – Мінск : Навука і тэхніка, 1989. – 142 с.
4. *Чыгрын, І. П.* Проза «Маладняка»: Дарогамі сцвярджэння / І. П. Чыгрын. – Мінск : Навука і тэхніка, 1985. – 144 с.
5. Еўрапейскі рамантызм і беларуская літаратура XIX–XX стст. / Ж. С. Шаладонава [і інш.] ; навук. рэд. У. І. Мархель ; НАН Беларусі, Інстытут мовы і літаратуры імя Я. Коласа і Я. Купалы. – Мінск : Беларус. навука, 2008. – 363 с.
6. *Луков, Вл. А.* Неоромантизм / Вл. А. Луков // Знание. Понимание. Умение. – 2012. – № 2. – С. 309–312.
7. *Лявонава, Е. А.* Беларускае мастацтва слова XX стагоддзя ў еўрапейскім літаратурным кантэксце: тыпалогія, рэцэпцыя, пераклад / Е. А. Лявонава. – Мінск : БДУ, 2014. – 319 с.
8. Беларуская савецкая проза. Апавяданне і нарыс / рэд.: В. В. Барысенка, П. К. Дзюбайла. – Мінск : Навука і тэхніка, 1971. – 328 с.
9. *Мацюхіна, Т. Б.* Духоўныя каштоўнасці неарамантызму ў беларускай літаратуры XX–XXI стст. / Т. Б. Мацюхіна // Научные стремления. – 2015. – 4 (16). – С. 58–61.
10. *Софронова, Л. А.* Польская романтическая драма: Мицкевич – Красиньский – Словацкий / Л. А. Софронова. – Минск : Наука, 1992. – 349 с.


*Поступила в редакцию 03.02.2026*